Фірыновіч А. Э. Пісьмовыя крыніцы Беларускага дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтва па вывучэнні гісторыі паўстання 1863—1864 гг. / А. Э. Фірыновіч // Працы гістарычнага факультэта БДУ: навук. зб. Вып. 6 / рэдкал.: У. К. Коршук (адк. рэд.) [і інш.]. — Мінск: БДУ, 2011. — С. 227–232.

***А. Э. ФІРЫНОВІЧ***

# ПІСЬМОВЫЯ КРЫНІЦЫ БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА АРХІВА-МУЗЕЯ ЛІТАРАТУРЫ І МАСТАЦТВА ПА ВЫВУЧЭННІ ГІСТОРЫІ ПАЎСТАННЯ 1863—1864 гг.

На працягу многіх дзесяцігоддзяў паўстанне 1863—1864 гг. неаднаразова станавілася аб'ектам даследавання вядучых гісторыкаў, філосафаў, філолагаў. Але і на сучасным этапе развіцця навукі тэма застаецца няпоўнасцю раскрытай. Аб'ектыўнае вывучэнне падзей 1863—1864 гг. ускладняецца залежнасцю гістарычных ацэнак паўстання ад ідэалагічных падыходаў у навуцы. Зразумела, што аснову гістарычнага даследавання ў першую чаргу ствараюць пісьмовыя крыніцы. Па гісторыі паўстання 1863—1864 гг. выяўлена і прааналізавана вялікая колькасць дакументаў, але ў большасці з замежных архівасховішчаў. Дакументальныя матэрыялы беларускіх архіваў, нягледзячы на тое што падзеі паўстання 1863—1864 гг. непасрэдна закранулі беларускія землі, вывучаны недастаткова. Папаўненне крыніцазнаўчай базы дакументамі з беларускіх архіваў з'яўляецца навуковай неабходнасцю ў аб'ектыўным раскрыцці праблемы.

Калекцыя матэрыялаў па гісторыі «студзеньскага паўстання», выяўленая ў Беларускім дзяржаўным архіве-музеі літаратуры і мастацтва (далей — БДАМЛ і М), складае 21 адзінку захавання — 28 дакументаў. Матэрыялы захоўваюцца ў 7 фондах — ф. 56 «У. С. Караткевіч», ф. 313 «А. А. Есакаў», ф. 78 «Союз писателей СССР», ф. 311 «К. Каганец», ф. 42 «Рэдакцыя часопіса «Полымя», ф. 12 «Рэдакцыя газеты «ЛіМ». Знаходжанне матэрыялаў у БДАМЛ і М адразу вызначае агульную спецыфіку збору. Прапрацаваныя дакументы ў сваёй сукупнасці прадстаўляюць літаратурныя гістарычныя творы і запісы. Гэта рукапісныя ці машынапісныя расклейкі з рэдакцыйнымі праўкамі будучых друкаваных варыянтаў. У абагульненым тэрміналагічным выглядзе дадзеную калекцыю можна назваць аўтарскай публіцыстыкай. Пры класіфікацыі разгляда-

**Фірыновіч Алена Эдуардаўна** — аспірант Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі



емых дакументаў, зыходзячы з прынцыпу вызначэння ўнутраных сувязей і іх напраўленасці, можна выдзеліць дзве групы матэрыялаў: а) гістарычныя крыніцы межасабовага накірунку без фіксаванага адрасата (для любога чытача); б) аўтакамунікатыўныя (для сябе).

Асобнай групай стаяць копіі афіцыйных дакументаў, што былі сабраныя даследчыкамі ў час працы над тэмай [3]. У першай групе вылучаюцца наступныя віды: шэсць п'ес, адно апавяданне, чатыры артыкулы, пяць рэцэнзій, адна рэкамендацыя і стэнаграма. Дзве п'есы і апавяданне належаць У. С. Караткевічу. Вядома, што аўтар шмат часу аддана працаваў над тэмай паўстання 1863—1864 гг. Яго творы пранікнёна распавядаюць аб вызначаных падзеях і заўсёды большай часткай закранаюць дзейнасць і жыццё Кастуся Каліноўскага. Два варыянты п'есы «Кастусь Каліноўскі» сэнсава не розняцца. Улічваючы творчы патэнцыял аўтара, у двух варыянтах назіраюцца толькі змяненні структурнага характару (месцы глаў, рэплікі), якія не нясуць сэнсавай нагрузкі і не мяняюць агульную канцэпцыю твора. Таму з упэўненасцю можна сцвярджаць, што версія п'есы, апублікаваная ў першай кнізе 8-га тома збора твораў пісьменніка, надрукавана ў 1990 г. без купюр.

Агульная канцэпцыя твора ярка выражаецца ў заўвагах У. С. Караткевіча да акцёраў, калі ішлі спробы паставіць п'есу ў тэатры імя Янкі Купалы. Ён бачыў гэта наступным чынам: «…Калі да подыху стагоддзяў дадаць яшчэ тое, што паўстанне асуджана на смерць з самага пачатку, ды гэтае наканаванне, якое ніхто не разумее, але адчувае кожны…І менавіта таму крый божа даць у характары Кастуся нешта ад «правадыра» [4, с. 67].

Тэорыя «трагізму ад пачатку», якая ўласціва пісьменніку, назіраецца і ў главе_апавяданні «Апошнія дні» [2]. Трагізм справы К. Каліноўскага аўтар паказвае і ў апошнія дні яго жыцця. Каліноўскі паўстае перад чытачамі героем, які спакойна ідзе на смерць, але ўпэўнены да апошняга, што яго народ атрымае волю і шчасце. Інакш абстаяла справа з раманам «Каласы пад сярпом тваім». У. С. Караткевіч даволі хутка напісаў раман, але пусціць яго ў друк не атрымоўвалася. З тэксту «Стэнаграмы аб'яднанага паседжання сакратарыята секцый прозы і крытыкі СП БССР» відаць, што адназначнай думкі наконт канцэпцыі рамана

не было. Праціўнікі патрабавалі значных змяненняў у падыходзе да апісання падзей (М. Лужанін), бо асноўная думка рамана не адпавядала ацэнкам падзей «студзеньскага паўстання» ў 60-я гг. XX ст. Так, у сваёй рэцэнзіі М. Лужанін патрабаваў: «Паказ беларускай вёскі, беднай, праз якую і для якой адбылося паўстанне, — першае, аб чым мусіць быць



аўтарскі клопат... Група Каліноўскага не павінна выглядаць кучкай ізаляваных змоўшчыкаў. Словам — неабходна паказаць яе сувязь з рускім рэвалюцыйным рухам» [11, с. 287].

Аб праблемах, з якімі сутыкнуўся пісьменнік пры публікацыі рамана «Каласы пад сярпом тваім», ён гаворыць у сваім лісце-заяве ў сакратарыят Саюза пісьменнікаў Беларусі: «Патрабуюць змяніць канцэпцыю (а яна ў мяне, лічу я, адпавядае эпосе, якую апісваю, норавам людзей, праўдзе аб паўстанні 1863—1864 гг.), адсунуць на другі план галоўных герояў, прыпісаць сялянству тую ролю ў паўстанні, якую яно пачало адыгрываць значна пазней (аб чым будзе ў другой частцы рамана)…» [8, с. 96].

Гістарыяграфія 60-х гг. XX ст. у паўстанні 1863—1864 гг. бачыла толькі сялянскі рух і яго вядучую ролю ў разглядаемых падзеях. Таму большасць пісьменнікаў не магла пагадзіцца з пазіцыяй У. С. Караткевіча і яго сяброў, напрыклад Г. В. Кісялёва, аб выразнай ролі інтэлігенцыі, перадавога дваранства ў паўстанні 1863—1864 гг. З цягам часу раман быў надрукаваны без значных змяненняў.

Тэндэнцыю творчага пошуку канчатковага варыянта твора можна назіраць і ў чатырох іншых п’есах. Гэта варыянты тэатральных пастановак «Кастусь Каліноўскі», створаных Я. Міровічам [5]. Сэнсава варыянты п’есы не адрозніваюцца адзін ад аднаго. Яскрава бачны змяненні «рабочага парадку» — карэкціроўка тэксту невядомай асобай, падбор акцёраў, перамяшчэнне рэплік, змяненне фону сцэны. На жаль, не ўстаноўлена, наколькі поўна п’еса дэманстравалася ў тэатры, але агульны падыход гістарыяграфіі 20-х гг. XX ст. да тэмы ў ёй праследжваецца. Яскрава відаць схемы класавай барацьбы, апісанні арганізаванага К. Каліноўскім сялянскага супраціўлення панам і царскай уладзе за роўнасць і свабоду.

Артыкулы і рэцэнзіі сабранай калекцыі храналагічна адносяцца да аднаго дзесяцігоддзя — 60-я гг. XX ст. Большасць з іх была надрукавана без купюр. Тэматычна артыкулы і рэцэнзіі прысвечаны значнасці Г. В. Кісялёва і А. Ф. Смірнова ў распрацоўцы тэмы «студзеньскага паўстання». Тут падкрэсліваюцца іх спецыфіка, новыя моманты ў даследаванні праблемы. Гэта быў значны рывок у вывучэнні гісторыі паўстання 1863—1864 гг. Аднак тры артыкулы былі надрукаваны з купюрамі. Асаблівасць купюр заключаецца ў іх характары — звычайнае выключэнне з друкаванага варыянта цэлых абзацаў, якія, напэўна, не адпавядалі прынятаму стандарту. Так, у апублікаванай рэцэнзіі С. Александровіча «На ўвесь голас» на кнігу Г. В. Кісялёва «Сейбіты вечнага» адсутнічаюць два абзацы з рукапіснага варыянта: «Загаварылі так, што даз-



воляць многа растлумачыць па-новаму, прымушаюць многае перагледзець, даюць магчымасць дапоўніць і ўдакладніць звесткі пра слаўных сыноў беларускага народа, якія ў суровыя і цяжкія дні 1863 г. выйшлі на барацьбу з рускім царызмам пад баявым сцягам «За нашу і вашу свабоду …» [6, с. 10]. Застаецца толькі выказваць меркаванні, чаму нязначна інфарматыўныя абзацы былі не надрукаваны. Магчыма, рэдактар палічыў іх лішнімі ў агульным аповядзе ці сказаць адкрыта пра барацьбу беларускіх сыноў за свабоду і незалежнасць у 60-я гг. XX ст. было памылковым выказваннем. Тое ж можна заўважыць і ў артыкуле С. Александровіча «З думай пра Беларусь»: «Г. Кісялёў падрабязна аналізуе рэвалюцыйную сітуацыю ў царскай Расіі і на Беларусі летам 1862 г., калі ў Брэсцкім павеце ўпершыню з’явілася «Мужыцкая праўда»: «Мы ясна бачым узрослую грамадскую актыўнасць сялянства к моманту адмены прыгоннага права. Аднак сялянскі антырэформенны рух не менш ярка прадэманстраваў і свае слабыя бакі… Падзелены на мноства светаў — вёсак, палітычна неразвіты, сяляне не разумелі сваёй сілы, не ведалі часта, дзе вораг і дзе сябры, і не былі здольныя ў той перыяд на свядомае, арганізаванае, шырокае, самастойнае выступленне» [10, с. 178]. Ненадрукаваны абзац яшчэ раз даказвае выказанае вышэй меркаванне, што казаць пра слабасць сялянства ў паўстанні 1863—1864 гг. у 60-я гг. XX ст. было немагчыма, бо агульнапрынятая ацэнка падзей вызначалася выключнай роллю сялянскага руху ў супраціўленні польскім панам і царызму. Пацвярджае гэта і купюра трэцяга артыкула В. Рагойшы «Даследчык (Г. В. Кісялёў) не закрывае вочы на тое, што перашкоджвала распаўсюджванню арыгінальнага выдання ў масы. Акрамя жорсткага паліцэйскага праследвання, называе непісьменнасць сялян, лацінскі шрыфт (ва Усходняй Беларусі) і інш.» [7, с. 2]. У рукапісе рэдактар падкрэсліў радкі «называе непісьменнасць сялян, лацінскі шрыфт». Гэта сведчыць аб несупадзенні афіцыйнага гістарыяграфічнага погляду і ацэнак аўтара. У агульных рысах думкі аўтараў зводзяцца да поўнай згоды з высновамі Г. В. Кісялёва і А. Ф. Смірнова. Пашыраны ўсхваленні гісторыкаў тыпу: «І заслуга Генадзя Кісялёва заключаецца менавіта ў тым, што з думай пра Беларусь, пра яе светлае будучае, ён, не шкадуючы сіл і часу, крапатліва і настойліва ўзнаўляе мінулае нашага народу, аб’ектыўна рэстаўрыруя гісторыю Бацькаўшчыны…» [7, с. 2].

Другая група дакументаў аб’яднана сваім мэтавым прызначэннем: «Асобныя старонкі з запісной кніжкі сям’і Кастравіцкіх з развітальнымі аўтографамі ўдзельнікаў паўстання Кастуся Каліноўскага» [1], «Письмо Г. Киселева Петру Федоровичу с просьбой публикации рецензии в



ЛіМе» [9]. Дадзеныя дакументы ствараліся для сябе, для задавальнення сваіх патрэб, таму іх можна назваць аўтакамунікатыўнымі.

Запісная кніжка мае старонкі, якія ўтрымліваюць інфармацыю пра гаспадарку, хатнія патрэбы. Зразумела, што кніжка служыла своеасаблівым «напамінальнікам», улікам грашовага расходу і даходу сямейнай гаспадаркі, статыстычным даведвальнікам для яе ўладара. Відаць, яна была заўсёды з гаспадаром, і так некаторыя яе старонкі сталі «развітальным подпісам» удзельнікаў паўстання Кастуся Каліноўскага. Тэкст большай часткай нельга прачытаць, пра некаторыя прозвішчы можна толькі здагадацца. Як гістарычная крыніца запісная кніжка прадстаўляе сабой алфавітны спіс удзельнікаў паўстання. Запісная кніжка паведамляе проста прозвішчы, аднак пры супастаўленні з іншымі дакументамі яна можа паслужыць важнай асновай у інфарматыўным дапаўненні гісторыі падзей 1863—1864 гг. [1].

Ліст Г. Кісялёва носіць памежавы характар. Яго нельга поўнасцю аднесці ні да афіцыйнага, ні да асабістага. Спачатку аўтар афіцыйна звяртаецца да рэдактара ЛіМа з просьбай публікацыі яго рэцэнзіі на польскае выданне «Русские, белорусы и украинцы в восстании 1863 г.» пад назвай «За нашу и вашу свободу», а затым кораценька распавядае пра свае справы і віншуе сябра з зімовымі святамі. Цікавасць ліста як гістарычнай крыніцы заключаецца ў яго латэнтным інфармацыйным паведамленні аб праблемах, з якімі сутыкаліся гісторыкі, пісьменнікі пры публікацыі сваіх твораў. Перш за ўсё гэта супадзенне аўтарскага падыходу з ідэалагічнымі прыярытэтамі вызначанага часу [9].

Апошняя група матэрыялаў прадстаўляе сабой копіі афіцыйных дакументаў, якія сабралі даследчыкі ў час сваёй працы над тэмай. У дадзеным выпадку гэта матэрыялы Г. Кісялёва. Даследчык вылучыў іх для напісання артыкула «Гімназічныя і студэнцкія гады Ф. Багушэвіча», што апублікаваны ў часопісе «Полымя» 1960 г. № 10 [3]. Тут сустракаюцца следчыя справы членаў сям’і Багушэвіча і іх сяброў аб удзеле ў паўстанні 1863—1864 гг. Усе яны паходзяць з Гістарычнага архіва Літвы, фонду 439. Аўтар падаў гэтыя дакументы поўнасцю ў дадатку да артыкула, што дае магчымасць самастойна рабіць высновы па справе сям’і Францішка Багушэвіча і яе дачыненні да паўстання.

Такім чынам, разглядаемая калекцыя вылучаецца сваёй літаратурнай накіраванасцю і мастацкім паходжаннем, аднак гэта не здымае яе вартасці як комплексу пісьмовых крыніц па гісторыі паўстання 1863—1864 гг. Выкарыстанне літаратурных твораў у якасці гістарычнай крыніцы мае сваю спецыфіку. Зразумела, што ўбачыць прычыну падзей у іх



цяжка, вядома роля суб’ектывізму аўтара ў апісанні рэчаіснасці, яго ацэнак. Але аналіз рукапісаў, параўнанне з апублікаваным варыянтам дае магчымасць выявіць агульныя тэндэнцыі, прыярытэтныя ацэнкі, падыходы да вывучаемых падзей, пануючыя меркаванні. Артыкулы і рэцэнзіі падкрэсліваюць вядучыя ідэі і погляды гісторыкаў 60-х гг. XX ст. на падзеі паўстання 1863—1864 гг., якое вызначалася ў гістарыяграфіі сялянскім характарам і моцным супраціўленнем беларускіх сялян польскаму ўладарству. Аўтографы вязняў папаўняюць новымі звесткамі спісы пакараных арыштам удзельнікаў паўстання.

**ЛІТАРАТУРА**


1. Асобныя старонкі з запісной кніжкі сям’і Кастравіцкіх з аўтографамі ўдзельнікаў паўстання Кастуся Каліноўскага. «Малітва за вязняў» // БДАМЛ і М. Ф. 311. Воп. 1. Адз. 14.
2. «Апошнія дні». Глава з кнігі «Кастусь Каліноўскі». Аўтограф // БДАМЛ і М. Ф. 56. Воп. 1. Адз. 6.
3. «Гімназічныя і студэнцкія гады Ф. Багушэвіча». *Г. Кісялёў.* Артыкул. Машынапіс з рэдакцыйнай праўкай // БДАМЛ і М. Ф. 42. Воп. 1. Адз. 289.
4. «Кастусь Каліноўскі» — «Руна пра Кастуся». Трагедыя. Да п’есы прыкладзены заўвагі аўтара для акцёраў. Аўтограф. Заўвагі да акцёраў // БДАМЛ і М. Ф. 56. Воп. 1. Адз. 7.
5. «Кастусь Каліноўскі». *Я. Міровіч.* П’еса. Варыянт. Машынапіс з аўтарскімі праўкамі // БДАМЛ і М. Ф. 313. Воп. 1. Адз. 207.
6. Министерство культуры и управления Союза писателей БССР. Редакция газеты «Літаратура і мастацтва»: С. Александровіч. Рэцэнзія «На ўвесь голас» на кнігу Г. В. Кісялёва «Сейбіты вечнага» // БДАМЛ і М. Ф. 12. Воп. 1. Адз. 960.
7. Министерство культуры и управления Союза писателей БССР. Редакция газеты «Літаратура і мастацтва»: В. Рагойша. Рецензия «Майстэрства рэстаўрацыі» на книгу Г. В. Киселева «Сейбіты вечнага» // БДАМЛ і М. Ф. 12. Воп. 1. Адз. 966.
8. Переписка с редакциями газет и журналов, издательствами по вопросам издания литературы: Заява Ул. Караткевіча ў сакратарыят Саюза пісьменнікаў Беларусі аб выданні рамана «Каласы пад сярпом тваім» // БДАМЛ і М. Ф. 78. Воп. 1. Адз. 170.
9. Письмо Г. Киселева Петру Федоровичу с просьбой публикации рецензии в ЛіМе // БДАМЛ і М. Ф. 12. Воп. 1. Адз. 641.
10. Редакция журнала «Полымя»: С. Александрович «З думай пра Беларусь» // БДАМЛ і М. Ф. 42. Воп. 1. Адз. 510.
11. Рэцэнзія М. Лужаніна на раман Ул. Караткевіча «Каласы пад сярпом тваім» // БДАМЛ і М. Ф. 78. Воп. 1. Адз. 153.

Артыкул пастyпiў у рэдакцыю 19 мая 2010 г.